3. Шеверинов, А.А. Разработка мобильного приложения для профориентационной работы в Лицее ВГУ имени П. М. Машерова / А.А. Шеверинов, В.Д. Смирнов ; науч. рук. Залесская Е.Н. // Молодежь XXI века: образование, наука, инновации : материалы XI Международной конференции аспирантов и молодых ученых, Витебск, 6 декабря 2024 г. – Витебск : ВГУ имени П.М. Машерова, 2024. – С. 15–16. https://rep.vsu.by/handle/123456789/45563.

# РОЛЯ ДЫДАКТЫЧНЫХ ГУЛЬНЯЎ ВА ЎЗБАГАЧЭННІ СЛОЎНІКАВАГА ЗАПАСУ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ

***Коваль Я.А.,***
*студэнтка 2 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – Васюковіч Л.С., доктар пед. навук, прафесар*

Ключавыя словы: дыдактычная гульня, слоўнікавы запас, развіццё маўлення, узбагачэнне і актывізацыя слоўнікавага запасу вучняў.

Сучаснае грамадства мае патрэбу ў індывідуумах, здольных развіваць, удасканальваць уласны разумовы патэнцыял. У медыцыне, тэхніцы, педагогіцы, у любой галіне жыццядзейнасці чалавецтва заўсёды імкнулася выгадаваць пакаленне інтэлектуалаў, якія ўмеюць вызначаць праблемы, знаходзіць іх рашэнні, фармуляваць гіпотэзы, даказваць або абвяргаць іх. Менавіта інтэлектуальны патэнцыял грамадства «складае тое багацце, што вызначае будучае кожнай краіны» [1, с. 112]. Падрыхтаваная асоба валодае культурай вуснага і пісьмовага маўлення, багатым слоўнікавым запасам, усведамляе мову як «інструмент пазнання, сродак абмену думкамі, які дапамагае асэнсаваць уласную маўленчую практыку, пераключыцца ад неўсвядомленага выкарыстання моўных сродкаў да ўсвядомленага» [2, с. 85]. Разумны чалавек дакладна фармулюе свае думкі, свабодна выкарыстоўвае ўсе віды маўленчай дзейнасці, нязмушана выбудоўвае зносіны з субяседнікамі рознага ўзроўню і статусу, любой нацыянальнасці і прафесіі. Узровень валодання мовай і маўленнем вызначае поспех у засваенні ўсіх вучэбных прадметаў. Адпаведна развіццё маўлення навучэнцаў – *актуальная мэта* моўнай школьнай адукацыі.

Асноўнымі задачамі навучання беларускай мове ў 1–4 класах з'яўляюцца развіццё маўлення, актывізацыя пазнавальнай дзейнасці, фарміраванне камунікатыўных уменняў малодшых школьнікаў. Істотным паказчыкам сфарміраванасці інтэлектуальна-маўленчых здольнасцей выступае багацце іх слоўнікавага запасу, які ўяўляе сабой зыходны будаўнічы матэрыял для выказванняў.

Часта малодшыя школьнікі, для якіх зусім нядаўна асноўным відам дзейнасці была гульнёвая, саромеюцца ўступаць у зносіны, неахвотна ўдзельнічаюць у дыялогах, пазбягаюць суразмоўніцтва. Калі педагог ужо з пачатку навучання будзе дабівацца таго, каб кожны першакласнік

стараўся гаварыць дакладна, лагічна, ахвотна, то ў наступных класах будзе істотна ўзбагачацца слоўнікавы запас вучня, будзе паспяхова развівацца маўленчая дзейнасць [3, с. 151].

Адным з напрамкаў дзейнасці па развіцці маўлення ў пачатковай школе з'яўляецца праца над словам (лексічны ўзровень), у рэчышчы якой вылучаецца некалькі напрамкаў:

– узбагачэнне слоўніка дзяцей;

– удакладненне слоўнікавага запасу навучэнцаў;

– актывізацыя слоўніка: пераход слоў з пасіўнага запасу ў актыўны;

– пазбаўленне нелітаратурныхслоў і выразаў [4, с. 241].

Пачынаць фарміраваць лексічныя ўменняў неабходна ў малодшым школьным узросце, які з'яўляецца сензітыўным для ўзбагачэння і актывізацыі слоўніка. Багаты лексічны запас спрыяе станаўленню камунікатыўных зносін дзяцей, што прадугледжвае круг маўленча-камунікатыўных уменняў: уступаць у зносіны, арыентавацца ў маўленчых сітуацыях і паводзінах субяседнікаў, фарміраваць жаданне дзяліцца сваімі інтарэсамі, пачуццямі, настроем; праяўляць спагадлівасць, чуласць, клопат, суперажываць, ацэньваць свае паводзіны і суразмоўцы, суадносіць уласныя маўленчыя ўчынкі ў мікрагрупе, класе; уменне давяраць адзін аднаму; даваць ацэнку сваім і чужым паводзінам [5, с. 108].

**Матэрыял і метады.** Пры аналізе паняццяў *слоўнікавы запас вучняў, дыдактычная гульня* выкарыстаны даследаванні айчынных і расійскіх вучоных (А.А. Айвазян, Г.М. Валочка, Л.П. Падгайскі, В.У. Протчанка, А.А. Смірнова, А.П. Шанько, М.Г. Яленскі і інш.). Для дасягнення мэты даследавання выкарыстоўваліся наступныя метады: аналіз навукова-метадычных крыніц, параўнанне зместу вучэбных праграм і школьных падручнікаў па беларускай мове для 1–4 класаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Узбагачэнне слоўнікавага запасу навучэнцаў уваходзіць у круг асноўных задач навучання мове на этапе пачатковай адукацыі. У слоўнікавай працы могуць быць задзейнічаны розныя прадметныя тэхналогіі: лексікаграфічная, сінквейная, кластарная, праектная [6, с. 15]. У малодшых класах пацвердзіла сваю эфектыўнасць дыдактычная гульня. Гульня спрыяе стварэнню эмацыйнага настрою, павышае працаздольнасць, забяспечвае магчымасць шматразова паўтарыць адзін і той жа матэрыял, пазбягаючы манатоннасці [5, с. 51].

Згодна з традыцыйнай класіфікацыяй, вылучаюць наступныя дыдактычныя гульні паводле характару педагагічнай дзейнасці:

– навучальныя, абагульняючыя, кантралюючыя, выхаваўчыя. Такія гульні прымяняюцца пры засваенні новых ведаў, выпрацоўцы ўстойлівых уменняў, для праверкі засвоенага матэрыялу;

– пазнавальныя, якія залежаць ад умоў, у якіх рэалізуецца навучальная дзейнасць;

– творчыя гульні, што даюць магчымасць самавыражэння праз эксперыментаванне, нестандартныя сітуацыі ўяўлення (*уявіце, што*…).

На нашу думку, для ўзбагачэння слоўнікавага запасу вучняў найбольш прыдатныя пазнавальныя гульні. Яны даступныя, цікавыя вучням, здольныя зрабіць навучальны працэс актыўным, прывабным і разнастайным. Разгорнем сутнасць і дыдактычныя асаблівасці некаторых гульняў. Так, у гульні «*Адгадай слова*» навучэнцам прапануецца група слоў. Некаторыя з іх дзецям знаёмыя, незнаёмыя раскрывае настаўнік з дапамогай вытлумачэння семантыкі. Гэтыя словы трэба аб'яднаць у групу праз адно слова, якое дзецям пакуль невядома. Адгадаць невядомае слова дзеці могуць пры дапамозе пошуку дапушчаных у гэтых словах памылкі. Няправільная ці лішняя літара і будзе элементам невядомага слова. Пераправерыць напісанне дзеці могуць пры дапамозе слоўніка (арфаграфічнага, арфаэпічнага, тлумачальнага і інш).

Гэтая гульня вымушае звяртацца да розных даведнікаў, у працэсе працы з імі навучэнцы знаёмяцца з іншымі адзінкамі, падбіраюць сінонімы, антонімы, запамінаюць іх значэнне. Такім чынам дзеці ўзбагачаюць лексічны запас, удасканальваюць навыкі працы са слоўнікамі розных тыпаў. Пасля правядзення гульні пажадана паразважаць з навучэнцамі, чаму важна ведаць шмат слоў і правільна іх ужываць. Гутарка можа суправаджацца вясёлымі ілюстрацыямі і жартоўнымі лексічнымі замалёўкамі.

Дыдактычная гульня «*Перагаворы*» прапануе адчуць сябе ўдзельнікамі актыўных маўленчых зносін. Дзеці павінны правесці перамовы са сваімі аднакласнікамі на зададзеную настаўнікам тэму. Гульня патрабуе ад навучэнцаў умення прыгожа і дакладна фармуляваць свае думкі, перадаваць іх аднакласнікам, задаваць пытанні. Назапашванне слоў тэматычных груп садзейнічае развіццю камунікатыўных уменняў. Навучэнцы на ўласным вопыце ўсведамляюць ролю маўлення ў вучэбных і жыццёвых сітуацыях.

**Заключэнне.** Вывучэнне і аналіз даследаванняў па праблеме дэманструе, што мэтанакіраванае фарміраванне лексічных уменняў малодшых школьнікаў варта разглядаць як істотную ўмову назапашвання імі станоўчага камунікатыўнага вопыту, што рэалізуецца ў розных маўленчых сітуацыях. Багаты лексічны запас навучэнца выступае істотнай умовай яго паспяховай пазнавальнай дзейнасці, свабоднага камунікавання з субяседнікамі. Дзеці, у якіх недастаткова сфарміраваны слоўнікавы запас, маюць вялікія цяжкасці ў навучанні, не знаходзяць слоў, каб сфармуляваць уласныя думкі, перадаць свае перажыванні, эмоцыі. Вучні з багатым слоўнікам характарызуюцца пазнавальнай актыўнасцю, жаданнем уступаць у зносіны са знаёмымі і незнаёмымі субяседнікамі, адкрытыя да камунікавання.

Адным з эфектыўных сродкаў фарміравання слоўніка дзяцей выступаюць дыдактычныя гульні. Выконваючы функцыю сродку навучання, яна выступае вядучым інструментам развіцця маўлення дзяцей. Дыдактычная гульня ўяўляе сабой шматпланавую, складаную педагагічную з'яву: з'яўляецца і метадам навучання, і формай яго арганізацыі, і самастойнай дзейнасцю, і сродкам выхавання асобы дзіцяці. Дыдактычныя гульні выкарыстоўваюцца для вырашэння задач маўленчага развіцця. Дзіця трапляе ў сітуацыі, у якіх вымушана выкарыстоўваць набытыя словы ў новых умовах, у лексіцы і дзеяннях, якія дыктуюцца абставінамі і характарам гульні.

Дыдактычныя гульні – эфектыўны сродак замацавання граматычных навыкаў, бо, дзякуючы рухомасці, эмацыйнасці і зацікаўленасці дзяцей, яны даюць магчымасць шматразова практыкавацца ў выкарыстанні пэўных формаў. Асаблівасць дыдактычных гульняў заключаецца ў фарміраванні спосабаў дзейнасці, у практычным выкарыстанні ведаў пры захаванні займальнага, творчага кантэксту. Гэта калектыўная, мэтанакіраваная пазнавальная дзейнасць, падчас якой кожны вымушаны суадносіць свае паводзіны з іншымі ўдзельнікамі.

Дыдактычныя гульні выконваюць развіццёвыя функцыі, вучаць засяроджанасці, уважлівасці, паслядоўнасці дзеянняў, пераадоленню цяжкасцей. Яны навучаюць разнастайным прыёмам вырашэння сфармуляванай задачы з дапамогай рацыянальных спосабаў пазнання, садзейнічаюць агульнаму развіццю і фарміраванню творчага патэнцыялу асобы. Падбор матэрыялаў для дыдактычных гульняў павінен прадвызначацца задачамі ўзбагачэння слоўнікавага запасу малодшага школьніка.

1. Субетто, А.И. Качество непрерывного образования: состояние, тенденции, проблемы, прогнозы: монография / А.И. Субетто. – СПб. : Исследовательский центр проблем качества образования, 2000. – 218 с.

2. Протчанка, В.У. Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове / В.У. Протчанка. – Мінск: НІА, 2001. – 212 с.

3. Айвазян, А.А. Основы работы по развитию связной устной речи младших школьников в современной системе образования / А.А. Айвазян // Наука и образование: новое время. – 2015. – № 1. – С. 150–154.

4. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах: вучэбны дапаможнік / Н.М. Антановіч [і інш.]; пад рэд. М.Г. Яленскага. – Мінск : Вышэйшая школа, 2020. – 263 с.

5. Смирнова, Е.О. Особенности общения с дошкольниками: учебное пособие / Е.О. Смирнова. – М. : Академия, 2000. – 160 с.

6. Николаенко, С.В. Лингвометодическая система социокультурного развития учащихся на основе овладения ценностями белорусской культуры в контексте изучения русского языка (V–XI классы): автореф. дис. … д-ра пед. наук: 13.00.02 / С.В. Николаенко ; НМУ «НИО». – Минск, 2016. – 64 с.